Источник: "Наша слова" - 2021-05-26

# "Кіч у мастацкай культуры сучаснай Беларусі"




У сталічнай краме "Акадэмкніга" набыў цікавую кнігу "Кіч у мастацкай культуры сучаснай Беларусі." Наклад выдання 400 асобнікаў. Яго рэцэнзенты: доктар мастацтвазнаўства В.І. Жук і кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт А.С. Бохан.

Аўтар кнігі, Бунеева Дар'я Юр'еўна, нарадзілася 23 красавіка 1988 г. у Баранавічах. Вучылася ў 2003-2007 гг. у Каледжы мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка, у 2007-2013 гг. - у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (Кафедра манументальна-дэкаратыўнага мастацтва), у 2013-2014 гг. - у магістратуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (спецыяльнасць "Мастацтвазнаўства"), з 2014 г. - у аспірантуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры. У 2018 г. абараніла дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці "17.00.04 - Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура". З 2013 г. выкладчыца ў Менскім дзяржаўным мастацкім каледжы імя А. К. Глебава. Выкладае спецдысцыпліны: жывапіс і кампазіцыю. З 2013 года з'яўляецца сябрам Беларускага саюза мастакоў. Удзельніца вялікай колькасці рэспубліканскіх і міжнародных выстаў.

Жыве ў Менску. Працуе ў галіне жывапісу, графікі, дызайну і ілюстрацыі кнігі

У мастацкім афармленні кнігі выкарыстаны фрагменты твораў А. Замай, У. Бугро, аўтарскія фатаграфіі і здымкі з адкрытых інтэрнэт-крыніц. Кніга надрукавана на высакаякаснай паперы. У выданні разглядаецца феномен мастацкага напрамку *кіч* і яго праявы ў творчасці сучасных беларускіх аўтараў - як самадзейных творцаў, так і прафесійных майстроў жывапісу, скульптуры і графікі. Робіцца спроба асэнсавання гэтай складанай з'явы, даецца вызначэнне яе асноўных стылявых рыс і тэматычных напрамкаў, а таксама крытэрыяў ідэнтыфікацыі і ацэнкі твораў з рысамі кічу.

Кніга з'явілася ў выдавецтве "Беларуская навука". Выданне разлічана на спецыялістаў-мастацтвазнаўцаў і прадстаўнікоў прафесій, якія маюць дачыненне да фарміравання сучаснай візуальнай медыяпрасторы, а таксама на больш шырокае кола чытачоў, зацікаўленых гэтым пытаннем.

***Аляксей Шалахоўскі,***
*гісторык культуры,*
*журналіст.*

Аляксей Шалахоўскі. "Кіч у мастацкай культуры сучаснай Беларусі"